## Новыя выданні па БМЗ




**T. Jasińska-Socha przy współpracy T. Chylak-Schroeder i J. Głuszkowskiej-Babickiej, *Język białoruski (poziom podstawowy i średnio zaawansowany). Z odpowiedziami do ćwiczeń*, pod red. R. Kalety, Warszawa 2020.**

Прапанаваны падручнік прызначаны для студэнтаў гуманітарных факультэтаў ВНУ, якія вывучаюць беларускую мову як замежную. Асноўная мэта падручніка – дапамагчы студэнтам набыць практычнае ўменне карыстацца сучаснай беларускай мовай, а таксама засвоіць граматычныя нормы беларускай мовы. Асаблівая ўвага акцэнтуецца на развіцці навыкаў вуснага маўлення. Вучэбны матэрыял складаецца з 10 тэматычных блокаў (напр. Сям'я, кватэра, навука, праца і г. д.). У кожным з іх знаходзяцца 3 раздзелы. У кожным раздзеле прыводзіцца асноўны тэкст публіцыстычнага ці мастацкага характару. Пасля тэксту даецца беларуска-польскі слоўнік. На аснове арыгінальнага тэксту прапануюцца рознага тыпу практыкаванні, неабходныя для разумення мовы з улікам граматычнага і лексічнага матэрыялу. Граматычны матэрыял і рэкамендацыі даюцца на польскай мове, каб лепш зразумець і выканаць практыкаванні. У кожным блоку змешчаны ў рамках (з указаннем "Запомні") характэрныя моўныя выразы і канструкцыі з мэтай іх запамінання. Для праверкі лексічнага і граматычнага матэрыялу ці самастойнай працы даюцца анекдоты, гумарэскі і нататкі, а таксама заданні перакладнога тыпу (галоўным чынам з польскай мовы на беларускую). У якасці загалоўкаў тэматычных блокаў (і раздзелаў) паслужылі выразы ці фразы, прыведзеныя з арыгінальных беларускіх тэкстаў, якія дасканала перадаюць моўныя асаблівасці беларускай мовы. Напр. IX блок: Маладым адкрыты ўсе шляхі.

1. Дзе і як мы вучымся?

2. Цішэй, ідзе сесія!

3. Я мару стаць...

Падручнік з'яўляецца другім дапоўненым выданнем кнігі 2017 г., у якой не было адказаў да практыкаванняў.

*Тэрэса Ясіньска-Соха, Радаслаў Калета*

*Варшаўскі ўніверсітэт*

*e-mail: rkaleta@uw.edu.pl*

***50 ćwiczeń z języka białoruskiego (poziomy: A1-B1+). Z odpowiedziami*, pod red. R. Kalety, Warszawa 2020.**

У гэты набор практыкаванняў па беларускай мове ўваходзяць заданні з падручніка Тэрэсы Ясіньскай-Сохі пад назвай Język białoruski (poziom podstawowy i średnio zaawansowany) (Беларуская мова (пачатковы і сярэдні ўзровень), які выдала кафедра беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта (Варшава 2017, 2-е выданне, Варшава 2020). Ён быў падрыхтаваны аўтарам гэтых слоў, таму што такія тэсты дагэтуль адсутнічаюць на польскім рынку, не хапае такіх матэрыялаў для практычных заняткаў па беларускай мове.

Практыкаванні, як і згаданы вышэй падручнік, прызначаны ў першую чаргу для студэнтаў бакалаўрыяту, якія не ведаюць беларускай мовы. Але карыстацца дапаможнікам могуць усе ахвотныя вывучыць мову Купалы і Коласа.

Практыкаванні дазваляюць навучэнцам праверыць свае веды, а ў канцы кнігі падаюцца адказы да практыкаванняў. Гэта дазваляе працаваць з кнігай не толькі на занятках з выкладчыкам, але таксама самастойна.

Гэтае выданне ўпершыню прапануе падзел практыкаванняў паводле еўрапейскіх ўзроўняў авалодання мовай (A1-B1 +).

*Радаслаў Калета*

*Варшаўскі ўніверсітэт*

*e-mail: rkaleta@uw.edu.pl*

*DOI: 10.32612/uw.bmz.2020.4.pp.52*